Адважныя сведкі веры

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.01.2017 00:00



Прыходзяць за паўгадзіны да пачатку літургіі, першымі прымаюць св. Камунію, узначальваюць Крыжовы шлях і распальваюць велікоднае вогнішча. Хто яны? Міністранты. Знаходзіцца ў прэзбітэрыі – вялікі гонар

Задачай пробашчаў з'яўляецца клопат аб тым, каб пры амбоне заўсёды меліся памочнікі. І так як, напэўна, няма касцёла, дзе не было б міністрантаў, адпаведныя душпастырствы існуюць у кожнай парафіі. Усе яны ўтвараюць агульнае Душпастырства літургічнай службы алтара Гродзенскай дыяцэзіі.

Цягам апошніх гадоў колькасць міністрантаў узрастае. Паступова адны пакаленні змяняюць другія, але сама спецыфіка служэння застаецца нязменнай. Мэта душпастырства – прывіць міністрантам любоў да літургіі. Данесці да іх свядомасці, што маюць гонар знаходзіцца бліжэй алтара – у прэзбітэрыі. А гэта патрабуе асаблівай увагі і адказнасці. † Існуе некалькі ўзроставых груп міністрантаў. Самыя старэйшыя называюцца "сеньёры". Яны звычайна ўжо маюць дарослых дзяцей і нават унукаў. Потым ідуць старэйшыя, якія працуюць, вучацца ў навучальных установах або выпускных класах у школе. І малодшыя. Яны таксама могуць падзяляцца ўнутры сваёй групы на ўзроставыя катэгорыі. Ёсць яшчэ кандыдаты ў міністранты і лектары (асобы, якія прызначаны для чытання Святога Пісання). Далучыцца да міністранцкай брацыі можа любы жадаючы. Але перад гэтым неабходна прайсці навучанне, падчас якога правяраецца адказнасць і сумленнасць кандыдата ў служэнні пры алтары. А пачынаецца "школа" яшчэ ў сям'і, калі бацькі вучаць сваіх дзяцей, як трэба паводзіць сябе падчас св. Імшы.

Касцёл павінен узрастаць

Адважныя сведкі веры

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.01.2017 00:00



